Клецкая З.М.,
канд.пед.навук.,
дацэнт
Пятровічава Л.І.,
канд.філал.навук,
дацэнт

# РЭФАРМАВАННЕ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ КУЛЬТУРЫ Ў ГАЛІНЕ РАБОТЫ З ДЗЕЦЬМІ

1. Сучаснасць патрабуе новых падыходаў да падрыхтоўкі кадраў культуры, асабліва гэта тычыцца работы з дзецьмі. Мы маем на ўвазе карэнную перабудову адукацыі ў гэтым напрамку. Больш нельга абмяжоўвацца ўдасканаленнем пэўных бакоў падрыхтоўкі ці пошукамі дадатковых напрамкаў адукацыі. Неабходна стварыць мадэль, структурныя элементы якой адлюструюць якасна новыя рысы спецыяліста, а ў самой мадэлі выявіцца постаць прафесіянала. Ён павінен адпавядаць не толькі сённяшнім патрабаванням грамадства, але ў большай ступені - будучым. Тыя, каго мы навучаем, будуць працаваць у XXI стагоддзі. Але ці спатрэбяцца такія прафесіяналы там, у блізкай ужо будучыні?

2. Жыццё паказала, што бібліятэкар-бібліёграф вышэйшай кваліфікацыі,якога мы рыхтуем, не адпавядае нацыянальнай, эканамічнай, палітычнай сітуацыі на Беларусі. Асноўная прычына ў тым, што мадэль такога спецыяліста - адбітак былых патрабаванняў да работніка культурнай установы. Бібліятэка, як вядома, лічылася ўстановай ідэалагічнай, накіраванай на прапаганду перш за ўсё палітычных ідэй. Вывучэнне вядучых спецыяльных дысцыплін па бібліяграфіі, бібліятэказнаўству пачыналася з усведамлення аб'ядноўваючай гэтыя навукі рысы - партыйнасці. Прынцып партыйнасці лідыраваў і сярод славутых у студэнцкім фальклоры прынцыпаў работы з чытачамі. Абумоўлена гэта канкрэтным разуменнем дзяржаўнай ролі бібліятэкі як паслугачкі імперыі. Такі пункт гледжання пакладзены ў аснову існуючых падручнікаў. Яны мэтанакіраваны на падрыхтоўку работніка, абавязанага праводзіць ідэі партыі і ўрада. Гэта адносілася да любых тыпаў бібліятэк, усіх катэгорый чытачоў, у тым ліку дзяцей, падлеткаў і юнацтва. Зараз увага не засяроджваецца на партыйнасці як асноўнай рысе спецдысцыплін, але падыход да іх выкладання прынцыпова не змяніўся. Так, напрыклад, кіраўніцтва чытачом падаецца як працэс ідэалагічнага ўздзеяння на погляды, інтарэсы чытача, яго асабістую пазіцыю.

3. Былая мадэль дзіцячага бібліятэкара не апраўдвае сябе, рыхтаваць спецыяліста па састарэлай схеме няма рацыі. Які спецыяліст патрэбен у наш час, каб выхаваць асобу разумную, гуманную, актыўную і працавітую, асобу вольную, якая мае свой погляд на рэчаіснасць і здольная самастойна прымаць рашэнні ў складаных жыццёвых абставінах?

Перш за ўсё гэта павінен быць псіхолаг і педагог высокага класа, таму што працэс уздзеяння на дзіця, падлетка немагчымы без прафесіянальнага валодання ведамі, навыкамі і ўменнямі на падставе дасканалага вывучэння цыклаў дысцыплін па псіхалогіі і педагогіцы.

Па-другое, гэта павінен быць прафесійны знаўца кнігі як сродка фарміравання асобы. Зазначым: кнігу патрэбна ўяўляць не толькі як крыніцу інфармацыі, але як комплекс мастацтваў - слова, вобразаў, малюнка. Адпаведна круг прафесійных ведаў уключае не толькі цыкл літаратурных дысцыплін, але і літаратуразнаўчых. Прафесіянал, які будзе выхоўваць дзіця, падлетка пры дапамозе кнігі, не зможа абысціся без ведаў па мастацтву. Кніжны вобраз у сучаснага дзіцяці,а тым больш падлетка, нярэдка другасны, ён накладаецца на ўжо атрыманы (кіно, ТБ, лялечны тэатр) гледачом канкрэтны вобраз. Спецыялісту па рабоце з дзецьмі неабходны навыкі выкарыстання розных відаў мастацтваў у працэсе ўздзеяння на дзіця як чытача, гледача, слухача. Аб гэтым сведчыць замежны і айчынны вопыт.

Такім чынам, у распрацоўцы новай мадэлі спецыяліста па культуры ў галіне работы з дзецьмі мэтазгодна абраць комплексны падыход, каб падрыхтаваць прафесіянала, здольнага карыстацца багаццямі розных відаў мастацтваў у залежнасці ад патрэб жыцця, мэт і задач выхавання.

4. Каб рэалізаваць такую мадэль спецыяліста, адукацыю мэтазгодна з улікам сусветнага вопыту планаваць па двух ўзроўнях (у два этапы). Першы прадугледжвае агульнаадукацыйную падрыхтоўку: выкладанне навук гуманітарнага цыкла (гісторыя, літаратура, мастацтва, педагогіка, псіхалогія, беларусазнаўства), а таксама выкладанне інфарматыкі. Тэрмін навучання - 2-2,5 гады.

На другім этапе ідзе спецыяльная падрыхтоўка.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Прапануецца вылучыць дзве галіны спецыяльнасці, кожная з якіх у сваю чаргу аб'ядноўвае спецыялізацыі па прынцыпу галоўнага накірунку практычнай дзейнасці спецыяліста.

1. Педагагічна-адукацыйная (фармуліроўка прыкладная, умоўная):

-- бібліятэкар-выкладчык беларускай (ці сусветнай) літаратуры;

-- бібліятэкар-выкладчык беларускага мастацтва (для школ, сярэдніх навучальных устаноў);

--бібліятэкар-выкладчык асноў беларусазнаўства (фальклор, міфалогія, этнаграфія і інш.);

-- бібліятэкар-краязнавец і арганізатар музеяў, экскурсавод.

2. Педагагічна-творчая:

-- бібліятэкар-кіраўнік фота-, кіна-, відэа- і іншых студый;

-- бібліятэкар-кіраўнік тэатра лялек і інш.;

-- бібліятэкар-кіраўнік студыі выяўленчага мастацтва і г.д.

Цітоў В.С.,
докт.гіст.навук,
дацэнт

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ І ПРЫНЦЫПЫ ПАБУДОВЫ ПРЫКЛАДНАЙ ПРАГРАМЫ КУРСА "ЭТНАГРАФІЯ (ЭТНАЛОГІЯ) БЕЛАРУСІ"

Этнаграфія, або этналогія (і той, і другі тэрміны маюць права на існаванне), - навука аб народах-этнасах, іх жыццядзейнасці, традыцыйнай культуры, міжэтнічных стасунках і ўзаемадачыненнях. Кожны народ мае ўласную гісторыю і гісторыка-культурную спадчыну, якая ўвасобіла шматвяковы працоўны вопыт, духоўныя высілкі і творчы плён многіх пакаленняў. Народ заўсёды быў сапраўдным творцам і носьбітам нацыянальных традыцый, якія ён руплівa захоўваў і ўзбагачаў, перадаючы як святыню ў спадчыну сваім нашчадкам.Нягледзячы на неспрыяльныя гістарычныя ўмовы, што не раз ставілі беларускі народ на мяжу генацыду і вынішчэння, яго традыцыйная культура, маючы здаровыя карані, пасля чарговай навалы зноў і зноў адраджалася на папялішчах і буяла маладымі парасткамі, выяўляючы жыццяздольнасць, унутраную імпульсіўнасць і багатую лакальную разнастайнасць.

Можна расцаніць як парадокс, што на працягу дзесяцігоддзяў этнаграфіі Беларусі ў сістэме адукацыі і падрыхтоўкі кадраў на гуманітарных факультэтах не надавалася элементарнай увагі. Аднак такое становішча не было выпадковым у краіне парадоксаў; яно якраз адпавядала утапічнай палітыцы, скіраванай на стварэнне уніфікаванага і сацыяльна аднароднага грамадства, сціранне нацыянальных граней і фарміраванне сілавымі метадамі новага савецкага чалавека. Аб'ектыўныя законы развіцця чалавечай цывілізацыі вяртаюць нас на натуральныя шляхі самавызначэння, сцвярджэння ўласнай годнасці і суверэнітэту, што дае больш шырокія магчымасці для раскрыцця ўнутраных сіл і рэалізацыі духоўных патэнцыялаў этнасу.

Пададзеная праграма курса ставіць на мэце даць студэнтам неабходныя веды па этнаграфіі Бацькаўшчыны, сфарміраваць адпаведныя навукова-даследчыя і практычныя навыкі, на аснове навукова апрабаванага, дакументальнага матэрыялу выхаваць свядомыя адносіны да нацыянальнай спадчыны, да гісторыі і культурных здабыткаў нашых продкаў. Яна ўлічвае найноўшыя дасягненні айчыннай і замежнай навук і зыходзіць з прынцыпаў навуковай аргументацыі, інфармацыйнай значымасці і даступнасці зместу, лагічнай паслядоўнасці і ўнутранай цэласнасці асобных тэм. Праграма ахоплівае шырокае кола пытанняў і прадугледжвае нароўні з традыцыйнай тэматыкай (народнае жыллё, адзенне, ежа, земляробства, промыслы і рамёствы) вывучэнне новых праблемных напрамкаў, якія раней не вывучаліся ці свядома ігнараваліся, у прыватнасці рассяленне беларусаў і іх этнічная тэрыторыя, праблемы этнагенезу, беларусы замежжа, этнічныя меншасці, амуніцыя і ўзбраенне беларускага войска, беларускія кірмашы і інш.

У залежнасці ад характару зместу ў тэматычнай структуры праграмнага курса можна ўмоўна вылучыць некалькі частак з адпаведным блокам пытанняў. Першая частка аб'ядноўвае тэмы ўводзін (прадмет этнаграфіі і яе сувязь з суседнімі дысцыплінамі), гістарыяграфіі, крыніц і метадаў этнаграфічнага даследавання, паняційнага апарату, якія ў шырокім сэнсе з'яўляюцца ўводзінамі да ўсяго курса. Другі блок тэм прысвечаны этнагенезу, этнічнай гісторыі, рассяленню беларусаў і іх узаемадачыненням і сувязям з іншымі народамі. Да гэтай часткі цесна прымыкаюць тэмы "Беларусы замежжа" і "Этнічны склад насельніцтва Беларусі". Трэцяя група пытанняў прысвечана матэрыяльнай культу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ